Дзяржаўная ўстанова культуры
"Цэнтралізаваная бібліятэчная сетка
Асіповіцкага раёна"
*Цэнтральная раённая бібліятэка*

*Серыя «Героі Савецкага Саюза - асіпаўчане»*

# ПОМНІМ ГЕРОЯЎ ЗЯМЛІ АСІПОВІЦКАЙ



# КАДАНЧЫК Сяргей Мікалаевіч

# КАДАНЧЫК
# Сяргей Мікалаевіч

**(12.09.1906 – 15.09.1943)**

## БІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА



**Каданчык Сяргей Мікалаевіч - камандзір 1339-га стралковага палка 318-й стралковай дывізіі 18-й арміі Паўночна-Каўказскага фронту, падпалкоўнік.**

**Нарадзіўся 12 верасня 1906 года у вёсцы Майсеевічы Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і. Беларус. Скончыў пачатковую школу.**

**У Чырвонай Арміі з 1928 года. У 1932 годзе скончыў Кіеўскія аб'яднаныя курсы падрыхтоўкі камандзіраў РККА. Удзельнік вызваленчага паходу савецкіх войскаў у Заходнюю Беларусь 1939года, савецка-фінляндскай вайны 1939-40 гадоў. Член ВКП (б) з 1940 года.**

**Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны з чэрвеня 1941 года. Ваяваў на Паўднёвым, Паўднёва-Заходнім, Закаўказскім, Паўночна-Каўказскім франтах. 13 снежня 1942 года маёр Каданчык С.М.**

прызначаны камандзірам 1339-га стралковага палка, воіны якога асабліва вызначыліся ў верасні 1943 г. пры вызваленні ад гітлераўскіх акупантаў чарнаморскага горада-порта Наварасійска Краснадарскага краю.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 18 верасня 1943года за ўмелае камандаванне стралковым палком, ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі і праяўленыя пры гэтым мужнасць і гераізм падпалкоўніку Каданчыку Сяргею Мікалаевічу пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Адважны камандзір палка загінуў смерцю храбрых на наглядальным пункце 15 верасеня 1943 года. Быў пахаваны ў горадзе Геленджык Краснадарскага краю. Перапахаваны ў брацкую магілу на плошчы Герояў у Цэнтральным акрузе горада-героя Наварасійска (у раёне вуліцы Саветаў і завулка Мічурына), дзе побач з ім спачываюць 20 старэйшых афіцэраў і адзін сяржант.

Узнагароджаны Ордэнам Леніна, ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі.Імем Героя названы вуліцы ў Новарасійску і Асіповічах, рыбалоўны траўлер.

# ГІСТОРЫЯ ПОДЗВІГУ

**ВЕРАСЕНЬ 1943 года. Над акупаваным гітлераўцамі Наварасійскам, над Цемескай бухтай стаяла насцярожваючая цішыня. Толькі ўспышкі асвятляльных ракет праціўніка папярэджвалі аб тым, што ён стаіўся і ў любы момант гатовы да бою. Падпалкоўнік С. М. Каданчык паглядзеў на гадзіннік. Дэсантны атрад, якім ён камандаваў, па першым сігнале гатовы быў кінуцца на выкананне загаду. Прыйшоў час, і сотні гармат напоўнілі наваколлі бухты. Пачаласяартылерыйская падрыхтоўка перад высадкай дэсанта. Вораг адкрыў агонь у адказ.То там, то тут падымаліся слупы вады ад разрываў снарадаў. Гітлераўцы імкнуліся паставіць заслон на шляху дэсантнай групы. Але катэры на вялікай хуткасці ўварваліся ў бухту, з ходу пераадолелі марскія і берагавыя перашкоды праціўніка. Так дэсантны атрад С. М. Каданчыка адкрыў шлях у бухту і да берага.**

**Дэсантнікі падпалкоўніка Каданчыка адначасова з іншымі атрадамі высадзіліся на бераг каля прыстані Імпартная і электрастанцыі.**

**Перад імі была пастаўлена задача захапіць плацдарм на беразе ўсходняга мола да прыстані Старая Пасажырская, ударам з тылу прарваць фронт і знішчыць ворага ў раёне цэментавага заводу пасёлка Адамава Бэлька і ў прыгарадзе Мефодз’еўскім. Праціўнік вёў агонь з усіх відаў зброі. Аднак задачу неабходна было выканаць. Ад гэтага залежаў поспех агульнай аперацыі. І кожны**

**воін разумеў гэта. Падпалкоўнік Каданчык быў разам з байцамі.Але катэр камандзіра, не дайшоўшы да берага, загарэўся ад прамых пападанняў мін і затануў. Некаторых з людзей, якія знаходзіліся на борце, у тым ліку і падпалкоўніка Каданчыка, выратавала судна, якое вярталася ў Геленджык. Прыбыў ён у свой полк на плацдарм толькі пад вечар.**

**Дэсантнікі ж дасягнулі электрастанцыі, выбілі на сваім шляху гітлераўцаў з дамоў, ператвораных ў доты і апорныя пункты.Праціўнік, падцягнуўшы сюды рэзервы, з другой паловы дня пачаў праводзіць моцныя контратакі пяхотай і танкамі, спрабуючы адбіць электрастанцыю. Сем контратак адбілі нашы воіны і на будынку паднялі чырвоны сцяг. І ўсё ж да вечара праціўніку ўдалося адціснуць некаторыя падраздзяленні да самае вады. Цемра і вялікія страты з абодвух бакоў аслабілі напружанне бою. Але ненадоўга.**

**10 верасня праціўнік сцянуў супраць палка Каданчыка вялікія сілы, аслабіўшы тым самым абарону на іншых участках. Становішча ўскладнілася яшчэ больш пасля таго, калі гітлераўцы адбілі ў дэсантнікаў мол і пачалі мініраваць бераг бухты, каб не дапусціць высадкі дэсантнікам падмацавання. Полк апынуўся амаль у акружэнні. Камандаванне накіравала другія палкі на важны апорны пункт гітлераўцаў - Цукровая Галава. Тут завязаліся вулічныя баі. Падаспела падмацаванне з суседняга палка. Вораг зноў быў адкінуты ад берага. Полк Каданчыка ўтрымліваў**

**свае пазіцыі да 14 верасня, працягваючы бесперапынныя баі..**

**Атрымаўшы новы загад - прарваць кальцо варожай абароны і выйсці на злучэнне з суседнім асаблівым батальёнам марской пяхоты - падпалкоўнік Каданчык хутка расставіў сілы і пачаў атаку. Яна была настолькі нечаканай, што вораг не вытрымаў націску. Яго абарона была прарвана.Пасля злучэння з марской пяхотай неабходна было працягваць прасоўванне да цэнтра горада.**

**Праціўнік пачаў канцэнтрыраваць сілы на іх шляху і рыхтаваўся да контратакі. Камандзір ўбачыў гэта. Павінен быць цяжкі бой.Фашысты абрынулі на пазіцыі палка шквал артылерыйскага агню, разлічваючы спыніць наступленне дэсантнікаў. Снарады рвалі кожны метр зямлі. Камандзір аператыўна кіраваў боем. Тут жа на баявым пасту Каданчык геройскі і загінуў.Як потым распавядалі, ён падняўся на званіцу, каб лепш назіраць за полем бою, і быў забіты прамым пападаннем варожага снарада.**

**Але ўсё ж полкКаданчыка выканаў баявую задачу. У адзіным парыве кінуліся ў атаку афіцэры, сяржанты і салдаты, змялі абарону праціўніка.16 верасня горад Наварасійск быў вызвалены.... Жыхары Наварасійска разам з воінамі аддалі даніну павагі загінуўшым і пахавалі іх на плоіхs горада, якая цяпер носіць імя Герояў. Падпалкоўнік Сяргей Мікалаевіч Каданчык 18 верасня 1943 года**

**пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.**



Все графы заполнять полностью

НАГРАДНОЙ ЛИСТ

1. Фамилия, имя и отчество КАДАНЧИК. Сергей Николаевич
2. Звание Подполковник 3. Должность, часть Командир 1339 стрелкового полка 318 стрелковой дивизии

Представляется к ордену "КРАСНОГО ЗНАМЕНИ".-

4. Год рождения 1906 5. Национальность Белорус 6. Партийность Чл.ВКП/б/-1940
7. Участие в гражданской войне, последующих боевых действиях по защите СССР и отечественной войне (где, когда) Война с Финляндией, в Отечественной войне с 23.6.41г на Юго-западном, Закавказском и Сев.Кавказском фронтах.
8. Имеет ли ранения и контузии в отечественной войне имеет два ранения.
9. С какого времени в Красной Армии С 1928 года. 10. Каким РВК призван .Кадровый.-
11. Чем ранее награжден (за какие отличия) Орд."КРАСНАЯ ЗВЕЗДА", в 1940 г. на войне с белофинами.-
12. Постоянный домашний адрес представляемого к награждению и адрес его семьи

I. Краткое, конкретное изложение личного боевого подвига или заслуг

1339 стрелковый полк, командиром которого является тов.КАДАНЧИК первый перешел в контрнаступление по приказу Командующего 47 Армии, будучи в составе 318 стрелковой дивизии. Благодаря опытному и умелому управлению полком со стороны командира полка тов.КАДАНЧИКА, в сложной обстановке ночного и дневного боя, взаимодействия огня и движения не нарушалось. Это дало возможность сломить упорное сопротивление превосходных сил 73 пехотной дивизии немцев, отбросить их, и выйти на выгодный рубеж. В период обороны полк тов КАДАНЧИКА не однократно выдерживал атаки немцев, которые отражались с большими потерями для врага.

Тов.КАДАНЧИК спокойный в бою, смелый и решительный командир. Заслуживает награждения орденом "КРАСНОГО ЗНАМЕНИ"

КОМАНДИР 318 СТРЕЛКОВОЙ ДИВИЗИИ
ПОЛКОВНИК /ВРУЦКИЙ/

"17" апреля 1943 года.

Командир (начальник)
(звание)

" " 191 г.

# ЛІТАРАТУРА


1. Каданчик Сергей Николаевич – Герой Советского Союза, род. в д. Моисеевичи // Навечно в сердце народном. – Минск, 1984. – С. 201.

2. Каданчик С. Н. // Герой Советского Союза: краткий биограф словарь. В. 2 т. Т. 1. – Минск, 1987. – С. 599.

3. Каданчик Сергей Николаевич [Текст] : биографические данные // Гордость и слава Могилёвщины. – Могилёв, 2005. – Т. 1: Герои Советского Союза. – С. 142.

4. Каданчик Сергей Николаевич : [Герой Сов. Союза, урож. д. Моисеевичи Осипов. р-на] // Республика Беларусь : энцикл. : В. 6 т. Т. 3 / ред. Г. П. Пашков. – Минск, 2006. – С. 826.

5. Каданчик Сергей Николаевич [Электронный ресурс] // Герои страны : интернет проект. – Минск, 2000-2013. – Режим доступа: http://www.warheroes.ru

6. Каданчик Сергей Николаевич [Электронный ресурс] // Электронный банк документов «Подвиг народа в Великой Отечественной войне 1941-1945 гг. – Режим доступа: http://www.podvignaroda.mil.ru